2. Асацыяцыя дадатковай адукацыі і асветы [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://adukatar.net/kak-sovmeshhat-priyatnoe-s-polezny-m-ili-chto-takoe-shvedskij-uchebny-j-kruzhok/. – Дата доступа: 12.03.2021 г.

3. Коджаспирова, Г.М. Культура профессионального самообразования педагога / Г.М. Коджаспирова. – М., 1994. – С. 69.

Коптелова Ю. С., студент 111 группы
Научный руководитель – Русак В. П.,
доктор филологических наук, доцент

## ФІЛАЛАГІЧНЫЯ НАТАТКІ ПРА ГОРАД БАБРУЙСК

На прыгожай сінявокай Беларусі ў кожнага з нас ёсць свой куточак зямлі, які асабліва дарагі сэрцу, якім ганарымся і якому прысвячаем свае творчыя задумы і радкі, прасякнутыя замілаванасцю і любоўю. Думаю, выкажу агульную думку, што гэта месца, дзе нарадзіўся, вырас, атрымаў першую адукацыю, дзе родны бацькоўскі кут, куды цяпер вяртаемся на канікулы. Не так важна, вялікі гэта горад ці маленькая вёсачка, галоўнае, што гэта самае роднае, любімае месца на вялікай планеце Зямля – Малая Радзіма, якая ў кожнага свая. Жадаю, каб кожны з нас пранікся гордасцю за свой “родны кут”.

Мая Бацькаўшчына – горад Бабруйск. Гэта самы буйны горад нашай краіны, які не з’яўляецца абласным цэнтрам. Ён мае багатую гісторычную спадчыну, вядомыя матэрыяльныя і культурныя каштоўнасці, славіцца таленавітымі землякамі.

**Мэта** даследавання: пашырэнне навукова-культурных ведаў аб беларускім горадзе Бабруйску. Для яе дасягнення пастаўлены наступныя **задачы:** пазнаёміць і папулярызаваць веды аб паходжанні абранага тапоніма; расказать пра найбольш цікавыя гісторычныя месцы горада,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

апісаць іх перспектыву; устанавіць згадванне пра г. Бабруйск у розных жанрах мастацкіх твораў: вершах, песнях, апавяданнях.

У сучаснай беларускай лінгвістыцы ёсць самастойная навука, якая называецца анамастыкай [*грэч*. onomastike – майстэрства даваць імёны], што вывучае любыя ўласныя імёны, іх паходжанне, гісторыю, асноўныя заканамернасці функцыянавання і развіцця. Адным з найбольш распрацаваных раздзелаў анамастыкі лічыцца тапаніміка [*грэч*. topos – месца і onyma – імя, назва], якая вывучае ўласныя назвы геаграфічных аб'ектаў. Унутрыгарадскія назвы вуліц вывучае частка тапанімікі, якая называецца ўрбананіміка [1]. Для мовы тапонімы з'яўляюцца бясцэннай крыніцай ведаў, даносячы да нас словы, якія раскрываюць многія гістарычныя загадкі. Так, у помніках розных перыядаў сустракаюцца назвы: Бобровск, Бобруевск, Бобрусек, Баброўскі, Бабруйск. Тапонім «Бабруйск», паводле пашыранага меркавання, утварыўся ад назвы ракі Бабруйкі, а вось гідронім (назва самой ракі) паходзіць ад слова 'бабёр'. Можна меркаваць, што горад празвалі так, бо ў старажытныя часы ў рацэ вадзілася багата баброў. А маім сучаснікам вельмі прыемна, што жыхары Бабруйска атрымалі ў 2006 г. сапраўдны падарунак: падчас фестывалю «Дажынкі» была ўстаноўлена скульптура «Бабра», выкананая з бронзы, якая важыць больш за 300 кілаграмаў. Зараз «Бабёр Самуілавіч» – сапраўдная славутасць Беларусі. Больш таго, невядома адкуль з'явілася прымета, што кожны, хто дакранецца да ланцужка бабра, абавязкова здабудзе багацце і поспех. Многія турысты, якія вандруюць па краіне, наведваючы наш горад, абавязкова імкнуцца дакрануцца да знакамітага талісмана і сфатаграфавацца з ім.

Наогул жа горад наш мае багатую гісторыю. Лічыцца, што першыя ўпамінанні пра яго як валасны цэнтр у складзе Вялікага Княства Літоўскага адносяцца да сярэдзіны XIV ст. Нават ёсць згадванне пра такі цікавы факт, што ў часы позняга Адраджэння (ў 1540 годзе) нямецкі навуковец палічыў Бабруйск настолькі сур'ёзным горадам, што адзначыў яго на геаграфічнай карце Еўропы нараўне з Масквой, Парыжам і іншымі буйнымі сталіцамі таго

часу. У тыя ж часы на беразе Бярэзіны быў пабудаваны першы замак, які, на жаль, не захаваўся да нашых часоў, згарэў. Але вядома, што ў сучасным Бабруйску налічваецца 14 помнікаў, якія занесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Галоўнае месца сярод іх па вартасці займае Бабруйская крэпасць.

Бабруйская крэпасць – гістарычны цэнтр горада, унікальнае збудаванне абарончай архітэктуры першай паловы XIX ст., будаўніцтва якой было распачата ў 1810 г. У гэтым годзе імператар Аляксандр I зацвердзіў Бабруйск месцам узвядзення адной з цытадэлей па лініі абароны заходніх межаў Расійскай імперыі. Першапачатковы план умацаванняў на месцы старажытнага замка XIV–XVII стст. у Бабруйску прапанаваў беларускі ваенны інжынер Тэадор Нарбут. Аўтарам генеральнага плана і кіраўніком узвядзення грандыёзнай крэпасці стаў граф Карл Оперман – вядомы інжынер-фартыфікатар, баявы афіцэр. Можна ўзгадаць, што работы пачаліся 4 чэрвеня 1810 г., а ў будаўніцтве ўдзельнічалі тысячы салдат і сялян, выкарыстоўваліся найноўшыя дасягненні еўрапейскага ваеннага майстэрства. У хуткім часе цытадэль была прылічана да першага класа абарончых збудаванняў імперыі, яе тэрыторыя складала амаль 120 гектараў, тэрыторыю крэпасці акружалі валы вышынёй да 10 метраў і равы, запоўненыя вадой з Бярэзіны і Бабруйкі. На ўмацаваннях размяшчалася больш за 300 гармат розных калібраў, запасы боепрыпасаў былі разлічаны на год, харчаванне – на паўгода асады. А ўжо ў 1812 г. Бабруйская цытадэль адыграла істотную ролю, прыняўшы асноўны ўдар арміі Напалеона, а пасля адыходу рускага войска генерала Баграціёна, гарнізон чатыры месяцы стрымліваў асаду французаў.

На другім этапе будаўніцтва (1812–1855) Бабруйская крэпасць ператварылася ва ўнікальны комплекс, знакаміты не толькі ўмацаваннямі, але і цудоўнай архітэктурай у стылі класіцызму. Нагадаем, што ў 1820–1823 гг. у крэпасці служылі арганізатары дзекабрысцкага руху, сярод якіх былі кіраўнікі Паўднёвага таварыства. Менавіта тут быў распрацаваны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

легендарны «Бабруйскі план» захопу Аляксандра I, які не ажыццявіўся. А ў 1825 г. крэпасць ператварылася ў казематы для палітычных вязняў і дзекабрыстаў, якія адбывалі пакаранне пасля паўстання на Сенацкай плошчы. У пачатку ж 1840-х гг. Бабруйская цытадэль – "старэйшая сястра" Брэсцкай крэпасці – была не толькі самой непрыступнай у Расійскай імперыі, але і адной з лепшых у Еўропе па ўзроўні ваеннага ўзбраення і аснасткі. Але ў 1868 г. Бабруйскую цытадэль перавялі ў другі клас абаронных збудаванняў (паколькі яна ўжо знаходзілася далёка ад межаў), а ў 1886 г. наогул пераўтварылі ў крэпасць-склад.

Падчас Вялікай Айчыннай вайны тут размяшчаўся нямецкі канцлагер для савецкіх ваеннапалонных, у якім загінула каля 40 тысяч салдат і столькі ж мірных жыхароў. Наш народ усё помніць і шануе здабытую перамогу. Памяці воінам-вызваліцелям прысвечаны радкі вядомага паэта М. Аўрамчыка:

Твае лясы прапахлі порахам.
Як чэрці ў пекле, у смале,
Кіпелі цэлы тыдзень ворагі
Ў Бабруйскім вогненным катле.

Сёння ад бастыёнаў Бабруйскай цытадэлі захавалася менш за палову, а на тэрыторыі крэпасці праводзяцца экскурсіі, здымкі фільмаў, археалагічныя даследаванні.

На берагах Бярэзіны нарадзіліся многія знакамітыя ў нашай краіне і за яе межамі беларусы: на Бабруйшчыне ў фальварку Панюшкавічы нарадзіўся пачынальнік беларускай літаратуры Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч (1807–1884), пісьменнік і грамадскі дзеяч Платон Галавач (1903–1937) родам з вёскі Гарбацэвічы, паэт, пісьменнік і перакладчык Мікола Аўрамчык (1920–2017) нарадзіўся ў в. Плёсы, а сучасны эстрадны спявак Руслан Аляхно нарадзіўся ў самім Бабруйску (1981) і інш. Многія вуліцы горада названы ў гонар землякоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Цікава, што Бабруйск даволі часта ўпамінаецца ў вершах, песнях, фільмах, кнігах. Так, чытаем У. Высоцкага «Перед выездом в загранку»: ...Личность в штатском – парень рыжий –

Мне представился в Париже:
«Будем с вами жить, я – Никодим.
Вел нагрузки, жил в Бобруйске,
Папа – русский, сам я – русский,
Даже не судим». (1965)

Пэўную вядомасць Бабруйск атрымаў у 1933 г., калі быў упамянуты ў кнізе «Золотой телёнок». А ўпершыню ў Ільфа і Пятрова Бабруйск узгадваецца ў фельетоне «Пташечка из Межрабпомфильма» (1929), які пачынаецца са слоў: «В городе Бобруйске случилось несчастье. Местный фотограф Альберт написал киносценарий. А так как Альберт был тонким ценителем изящного и по рассказам бобруйских старожилов превосходно знал все детали великосветской жизни, то сценарий вышел полнокровный...». Вельмі прыемна, што ўзімку 2012 г. каля воданапорнай вежы ўсталявалі скульптуру Шуры Балаганава**.** Горад узгадваецца ў іранічным кантэксце «Песня гуру» (1982) Майка Навуменкі, лідэра рок-групы «Зоопарк»: «Здрасьте! Я родом из Бобруйска...». У Бабруйску рэжысёрам Аляксандрам Карпавым на кінастудыі «Беларусьфільм» быў зняты мастацкі фільм аб беларускіх партызанах «Свадебная ночь» (1980). Падзеі ў фільме разгортваюцца летам 1942 г. Фільм расказвае аб гераізме і вайне, аб сяброўстве і каханні.

Такім чынам, я шчыра ўдзячная магчымасці ўзгадаць некалькі штрыхоў з багатай тапанімікі горада майго дзяцінства. Маёй малой радзімы, якая радавала вока і дарыла пачуццё напоўненасці і спакою, таго куточка, куды заўсёды хочацца вяртацца, для якога хочацца зрабіць шэраг карысных спраў. Я ганаруся маім Бабруйскам, яго гісторыяй і людзьмі. А завяршу выступленне шчырымі думкамі майго знакамітага земляка, Ганаровага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грамадзяніна Бабруйшчыны, вядомага паэта Міколы Аўрамчыка: Мая Бабруйшчына зялёная,

Здаешся іншым ты малой
З тваёй Бярэзінай хвалёнаю
І з непрыкметнаю Алой.
А мне заўсёды паўнаводнымі
Здаваліся іх берагі,
Былі мясціны роднымі,
Куток з маленства дарагі.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Беларуская мова. Энцыклапедыя / рэд. А.Я. Міхневіч. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1994. – 513 с.

2. https://wiki.bobr.by/Интересные_факты_о_Бобруйске

3. Аўрамчык, М.Я. Мая Бабруйшчына зялёная / М. Аўрамчык. Выбраныя творы. У 2-х т. Т. 1. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1980. – С. 164.

Коптюх Е. Ю., студент 511 группы
заочной формы обучения
Научный руководитель – Калашникова А. В.,
доцент кафедры

# СОЦИАЛЬНО-КУЛЬТУРНЫЕ АСПЕКТЫ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ СОВРЕМЕННЫХ КАВЕР-БЕНДОВ

Современные кавер-бенды пользуются устойчивым спросом и популярностью у населения. Как правило, эти любительские музыкальные коллективы активно участвуют в организации досуга и выступают «посредником» между населением и массовой культурой, белорусскими музыкальными традициями и мировой музыкой. Кавер-группы (кавер-бенды)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ